ISSN 2524-2369 (Print)
ISSN 2524-2377 (Online)
УДК 398.3(=161.3)
https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-80-87

Паступіў у рэдакцыю 24.02.2021
Received 24.02.2021

Н. А. Гулак

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Мінск, Беларусь

ЖАНРАВАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ НАРОДНАЙ ДРАМЫ Ў ПРАСТОРЫ АБРАДАВАЙ КУЛЬТУРЫ

Аннотация. Представлен редкий факт народной традиции, зафиксированный белорусскими учеными в Речицком районе во время Минско-Гомельской этнографической экспедиции 1956 г. Его сравнительно-историческое изучение позволяет выдвинуть гипотезу о бытовании в конце XIX – начале XX века на территории белорусского и украинского Полесья самобытного обходного обряда щедрования, в основе которого лежит показ позднетрадиционной модификации народной драмы «Царь Максимильян». Наиболее полно рефлекс этого явления наблюдается в известном сегодня обряде «Цари» д. Семежево Копыльского района. Привнесению редуцированной нестационарной формы народной драмы в обрядность белорусов во второй половине XIX в. способствовало культурное взаимодействие жителей местечек и крестьян с солдатами. Нижние чины российской армии являлись представителями той социально-профессиональной группы, в среде которой показы народной драмы были особенно развиты и санкционированы. Ставится проблема переосмысления ряда принятых в белорусской фольклористике положений и упрощенных оценок, интерпретирующих социальную природу и семантику позднетрадиционных явлений народного творчества.

Ключевые слова: обрядовый обход, солдат, «Царь Максимильян», народная драма, Семежево

Для цитирования: Гулак, Н. А. Жанравая трансфармацыя народнай драмы ў прасторы абрадавай культуры / Н. А. Гулак // Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманітар. навук. – 2022. – Т. 67, № 1. – С. 80–87. https://doi. org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-80-87

Nastassia A. Hulak

Belarusian State University of Culture and Arts, Minsk, Belarus

GENRE TRANSFORMATION OF FOLK DRAMA IN THE SPACE OF RITUAL CULTURE

Abstract. The article presents rare fact of folk tradition recorded by Belarusian scientists in the Rechitsa region during the Minsk-Gomel ethnographic expedition in 1956. A comparative historical study allows us to put forward a hypothesis about the existence of a unique Christmas rite at the end of the 19th – beginning of the 20th centuries on the territory of the Belarusian and Ukrainian Polesie. The ceremony is based on a modification of the folk drama "Tsar Maximilians". There is a reflex of this phenomenon in the ritual known today "Tsars" in the village of Semezhevo, Kopylsky district. The reduced non-stationary form of folk drama penetrated into folklore in the second half of the 19th century. This was facilitated by the cultural interaction of the indigenous population with representatives of the social and professional group of the military. It was among the Russian army that shows of folk drama were developed. The problem of rethinking a number of provisions and simplified assessments accepted in the Belarusian folklore studies is posed.

Keywords: Christmas caroling, soldier, "Tsar Maximilian", folk drama, Semezhevo

For citation: Hulak N. A. Genre transformation of folk drama in the space of ritual culture. *Vestsi Natsyyanal'nai akademii navuk Belarusi. Seryia humanitarnykh navuk = Proceedings of the National Academy of Sciences of Belarus. Humanitarian Series,* 2022, vol. 67, no. 1, pp. 80–87 (in Belarusian). https://doi.org/10.29235/2524-2369-2022-67-1-80-87

Уводзіны. Экспедыцыйныя матэрыялы розных гадоў, якія захоўваюцца ў фальклорнай калекцыі аддзела фальклярыстыкі і культуры славянскіх народаў ЦДБКМЛ НАН Беларусі, уяўляюць сабой унікальную крыніцу вывучэння народнай традыцыі XIX–XX стст.

Адзначым, што ў 1950-я гг. у савецкай навуцы тэарэтычнае асэнсаванне і публікацыя ўзораў вусна-паэтычнай творчасці стрымліваліся моцнымі ідэалагічнымі ўстаноўкамі, але пры гэтым экспедыцыйная работа, наколькі гэта дазвалялі ўмовы пасляваеннага часу, разгортвалася больш

© Гулак Н. А., 2022

актыўна[1]. Яе арганізоўвалі і бралі ў ёй удзел Маісей Грынблат, Леў Бараг, Марыя Мееровіч, Лідзія Мухарынская, Генадзь Цітовіч, Рыгор Шырма, Іван Гутараў, Іван Даўгяла, Міхась Клімковіч, Іван Чыгрын, Анатоль Клышка і іншыя навукоўцы, дзеячы культуры, энтузіясты. У той час будучы даследчык народнай культуры і гісторыі фальклярыстыкі, літаратар і педагог Іван Кірылавіч Цішчанка (1930–2001) толькі пачынаў свой шлях у навуцы, выходзілі яго першыя публікацыі пра дзеячаў беларускай культуры. Важным шляхам спасціжэння народнай творчасці ва ўсім багацці яе рэгіянальных праяў І. К. Цішчанка лічыў «выезды ў поле» – фальклорна-этнаграфічныя экспедыцыі. Увагу аўтара прыцягнуў запіс абыходнага абраду з Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, зроблены І. К. Цішчанкам у ліпені 1956 г. падчас Мінска-Гомельскай этнаграфічнай экспедыцыі АН БССР.

Асноўная частка. Зафіксаваны факт абрадавай традыцыі з'яўляецца *калядным абыходам* (Дадатак) і належыць да вялікай групы такіх абыходаў, прадстаўленай у культуры славян мноствам формаў і варыянтаў. Паводле Л. Вінаградавай, іх тыпалогія вызначаецца часавай прымеркаванасцю, складам удзельнікаў і характарам выконваемага рэпертуару. Тыпы калядавання дыферэнцыруюцца на падставе ўключаных у абрад магічных дзеянняў ці асаблівых рытуальных сімвалаў [1, с. 570–571]. Найбольш распаўсюджаная форма – калядныя абыходы з дамінуючай роляй абрадавых ці народна-рэлігійных тэкстаў (*вербальны рытуал*), дзе вылучаюцца абыходы немаскаваных і маскаваных калядоўшчыкаў. Спецыфікай абыходаў маскаваных удзельнікаў з'яўляецца тое, што вербальны рытуал дапаўняюць драматычныя і гульнёвыя элементы, у цэнтры якіх персанаж у зааці антрапаморфным абліччы, напрыклад, *ваджэнне* «*казы*», *«каня», «мядзведзя», «тура»* (усходнеслав.), *шчадраванне* (бел., укр.)*, Маланка* (укр.), *овсеньканье* (рус.), *Конікі* (бел.)*, Калядныя цары* (бел.). Іншая форма – абыходы з мэтай выканання магічных дзеянняў (*раскідвання зерня, аблівання вадой гаспадароў, вымятання хаты* і інш.). Да іх прымыкаюць абыходы з рытуальнымі прадметамі (*калядная зорка, фігурка Хрыста, плуг, галінкі, палачкі, упрыгожанае дрэўца*). Пры некаторай умоўнасці гэтай класіфікацыі яна вызначае асноўныя параметры разглядаемай з'явы.

Так, рэчыцкая традыцыя, відавочна, можа быць аднесена да найбольш распаўсюджаных абыходаў з маскаванымі персанажамі. Яе вярбальна-акцыянальны код вызначаюць элементы народнай драмы «Цар Максімілян», кантамінаваныя з гульнёва-драматызаванымі дзеямі «ваджэння казы». Нельга не заўважыць, што яна з'яўляецца рэдукаваным варыянтам ці мадыфікацыяй каляднага абыходу, вядомага пад назвай «Цары», які сёння захаваўся ў лакальнай культурнай традыцыі в. Семежава Капыльскага раёна Мінскай вобласці[2].

На тоеснасць указваюць прымеркаванасць абедзвюх з'яў да Каляд (Шчодры вечар), абыходны характар (*ходзяць яны па хатах, іграюць, спяваюць, праздраўляюць гаспадароў. Ім давалі за гэта хто што*), склад удзельнікаў (*хлопцы чалавек трыццаць*), касцюмы, характар вобразаў (*зробяць салдацкую адзежу, купяць эпалеты; там у іх былі цар, Адолька – сын цара, доктар, жыд, цыган*). У тэксце І. Цішчанкі, як і ў семежаўскім абыходзе, праяўлены абрысы сюжэту народнай драмы «Цар Максімілян» (*цар прымушае непакорнага сына Адольку пакланіцца кумірскім багам, цар забівае Адольку* і інш.). Аднак асноўнай для семежаўскіх «Цароў» сюжэтнай лініі двубою ў рэчыцкім запісе не прасочваецца, хаця трэба ўлічваць і тое, што тут мы маем справу з вельмі малым фрагментам народнай традыцыі. Звяртае на сябе ўвагу ўстойлівасць у памяці інфарматара рэплікі доктара (*А я так лячу: скулы выразаю, балячкі ўстаўляю. Ка мне прыходзяць на нагах, а ўязджаюць на санях*), што служыць паказчыкам уплыву інтэрмедыйных сцэн батлейкі («Мацей і доктар») на народную драму і праз яе – на калядны абыход.

Слова «маскарад» у мове інфарматара – непісьменнай жанчыны, якой у 1956 г. споўнілася 79 гадоў, відавочна, засвоена ёю з традыцыі. Яшчэ ў 1912 г. Е. Раманаў адзначаў, што менавіта пад назвай «Мушкарат» на Гомельшчыне была вядома народная драма з кантамінаванымі сюжэтамі «Цара Ірада» і «Цара Максіміляна». У Гомелі і Беліцы, на радзіме даследчыка, «Мушкарат» ставіўся неаднаразова [2, с. 73]. Заўважым, што падчас устойлівага бытавання ў рэгіёне

[1] Цэнтрам гэтай дзейнасці быў сектар этнаграфіі і фальклору Інстытута гісторыі АН БССР да таго часу, пакуль у 1957 г. на базе структур Інстытута гісторыі і Інстытута літаратуры не быў створаны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР.

[2] У 2007 г. калядны абрад «Цары» вёскі Семежава ў катэгорыі «Традыцыйныя цырымоніі» быў унесены ў Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС), уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь. У 2009 г. абрад «Цары» ўключаны ў Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА, якой патрабуецца тэрміновая ахова.

гэтай з'явы інфарматар І. Цішчанкі – Фядосся Сафронаўна Сівуха з в. Ровенская Слабада – была дарослым чалавекам.

Тыпалагічна падобныя калядныя абыходы з канём Е. Раманаў фіксаваў у некалькіх вёсках на поўдні Гомельскага павета[1]. Паводле кароткіх звестак, убраннем часткі персанажаў абрадавага маскавання быў «вайсковы» касцюм, падобны на семежаўскі і рэчыцкі. Так, адзін з хлопцаў-удзельнікаў прыбіраўся афіцэрам: «вайсковы мундзір і штаны, на галаву папяровы ківер з султанам, праз плячо блакітную стужку з паперы», яшчэ адзін – «у вайсковы мундзір, але без стужкі і з галаўным уборам накшталт уланскага» [2, с. 109–111]. Адзначым, што менавіта элементы касцюма[2] вызначаны як асноўныя матэрыяльныя аб'екты, звязаныя з практыкай каляднага абыходу ў в. Семежава [3].

Натуральна, асобныя запісы збіральнікаў не могуць даць уяўленне пра арэал распаўсюджання пэўнай з'явы, яе лакальна-рэгіянальныя асаблівасці і інш. Аднак яны важныя ў сэнсе назапашвання фальклорнай эмпірыкі і акрэслення новых кантэкстаў, міждысцыплінарных падыходаў да вывучэння гэтай з'явы. Спынімся на некаторых крыніцах, якія паведамляюць пра калядныя абыходы з інтэгравanымі ў іх элементамі народнай драмы, і звернем увагу на прысутнасць у іх «вайсковага кампанента». Такіх крыніц даволі шмат, гэта «опыты разыскания», запісы народнай драмы з каментарыямі, апублікаваныя ў гісторыка-літаратурных, гісторыка-этнаграфічных і мовазнаўчых выданнях[3] у канцы XIX – пачатку XX ст. Калі разглядаць з'яву з беларускацэнтрычных пазіцый, то робіцца відавочным, што адным з арэалаў ці, дакладней, кантактнай з беларускім Палессем зонай распаўсюджання калядных абыходаў, у аснове якіх знаходзіцца сінтэтычная драматычная дзея «Цар Максімілян» з маскаваннем удзельнікаў у вайсковы касцюм і адпаведнай атрыбутыкай, было Чарнігаўскае і Валынскае Палессе.

У 1887 г. часопіс «Киевская старина» публікуе нататку «"Царь-Максимильян" в Ковеле», у якой паведамляецца, што ў павятовы горад Ковель Валынскай губерні народная драма «занесена прышлым салдатам» і бытуе ў форме каляднага абыходу хлопцаў-мяшчан. Рэпетыцыі адбываюцца ў Піліпаў пост: «І сама п'еса, і яе выкананне вельмі цікавыя. Ковельскія хлопцы гуляюць з натхненнем, нязмушана і часам вельмі добра, відаць, што яна ім падабаецца. <…> Некалі вельмі даўно лёс завёў у Ковель адстаўнога салдата, і пасяліўся ён на ўскрайку горада. Адкуль ён сам быў родам, як яго звалі, ніхто таго не ведае, ведаюць толькі, што ён сабраў мясцовых хлопцаў, паведаміў ім змест п'есы, патлумачыў, усё паказаў <…> Салдат памёр, а занесеная ім "камедыя" жыве ў Ковелі і цяпер і абавязкова выконваецца штогод падчас святкаванняў Ражства. Форма яе вершаваная, змест прыстасаваны да святочнай падзеі, падобны да "Вяртэпа", мова змешаная – велікаруска-маларуска-польская» [4, с. 799].

У даследаванні А. Малінкі «К истории народного театра» (1897) ёсць узгадкі пра каляднае прадстаўленне-абыход у Нежынскім павеце Чарнігаўскай губерні, якое выконвалі салдаты «з дазволу свайго начальства». У 1899 г. літаратуразнаўца і бібліёграф У. Калаш публікуе варыянт народнай драмы, запісаны ў павятовым Глухаве Чарнігаўскай губерні. Тут «Цар Максімілян» таксама існуе ў форме каляднага абыходу, які робяць хлопцы рамесніцкага саслоўя. З рэквізіту ўказваецца *трон*, падкрэслены дэталі касцюмаў: <на цары> «салдацкі ці афіцэрскі мундзір, такі, які ўжо здолелі дастаць артысты, на мундзіры пагоны ці вісячыя эпалеты, сапраўдныя ці зробленыя з картону, каляровай паперы ці *шуміхі* (назва *мішуры* ў XIX ст. – *Н. Г.*), шабля ці цясак, праз плячо – чырвоная стужка. На грудзях ордэн і зорка. На галаве шалом з султанам, зроблены з бляхі ці з картону і сусальнага золата» [5, с. 6].

---

[1] Сёння – вёскі Леніна (былая Папоўка), Красная Буда Добрушскага раёна, Юркавічы Веткаўскага раёна.

[2] «Хлопцы-"цары" апранаюцца ў белыя кашулі, белыя штаны, падпярэзваюцца чырвонымі семежаўскімі паясамі з геаметрычным арнаментам, грудзі таксама перавязваюць крыж-накрыж, на шыю павязваюць жаночую вялікую хустку-"тарыноўку" ў вялікую клетку або ў кветкі, якая закладваецца за паясы. На нагах "цароў" – чорныя боты, на галаве – высокія папяровыя шапкі з рознакаляровымі стужкамі і кутасамі. Ва ўсіх "цароў" з левага боку прымацавана шабля <…>».

[3] На мяжы стагоддзяў ва ўсходнеславянскім народазнаўстве акрэсліваецца навуковае зацікаўленне народнай драмай. Найбольшая колькасць матэрыялаў убачыла свет у часопісе «Этнографическое обозрение» Таварыства аматараў прыродазнаўства, антрапалогіі і этнаграфіі пры Маскоўскім універсітэце. Матэрыялы на гэтую тэму таксама давалі «Известия Отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук» (Санкт-Пецярбург), «Записки Наукового товариства ім. Шевченка у Львові», «Русский филологический вестник» (Варшава), «Вестник географического общества» (Санкт-Пецярбург), «Кіевская старина» і інш.

У Ноўгарад-Северскім павеце Чарнігаўскай губерні, паводле звестак Р. Волкава, паказы «Цара Максіміляна» пад назвай «Маскарад» мелі абыходны характар і ладзіліся разам з «Казой» і «Зоркай». Адзначым істотныя супадзенні ноўгарад-северскага і семежаўскага тэкстаў у частцы звароту да публікі і самаўсхвалення Цара Максіміляна. Касцюмы асноўных удзельнікаў п'есы – салдацкія мундзіры, пераважна кавалерыйскія (гусарскія і ўланскія), якія мясцовая моладзь звычайна брала ў сяле Івот, «насельніцтва якога служыла ў кавалерыі і гвардыі» [6, с. 3].

У 1897 г. этнограф В. А. Машкоў апісаў прадстаўленне «Цара Ірада» ў м. Славута Валынскай губерні, якое ладзілася гуртамі хлопцаў падчас Каляд. Галоўны персанаж быў «у салдацкім мундзіры, наверх якога накінута чырвоная мантыя, падпярэзаны чырвоным кушаком, абклееным залочанай паперай; праз левае плячо павешана каляровая папяровая ордэнская стужка, а праз правае – шашка на партупеі <…>». У вайсковых касцюмах іншых персанажаў адзначаны

і інш. [7, с. 233–234].

Як бачым, найбольш паслядоўна этнографы адлюстроўвалі тэмпаральны і атрыбутыўны аспекты абрадавых абыходаў, акцэнтуючы ўвагу на элементах касцюма ўдзельнікаў як асноўных матэрыяльных аб'ектах, звязаных з практыкай іх бытавання. У сістэме персанажнага кода, акрамя вобразаў класічнай батлейкі, асобную падсістэму ўтвараюць вайсковыя вобразы ( ), як і «вайсковыя прыёмы» ў кантэксце народнай драмы [8, с. 97]. У калядных абыходах, больш дынамічных за стацыянарныя паказы, гэтыя прыёмы былі засвоены і прадуктыўна развіліся (

і інш.).

З увагай на выяўленыя кампаненты асноўных кодаў можна разгледзець іншыя з'явы ўсходнеславянскай народнай традыцыі, напрыклад, украінскае народна-рэлігійнае свята «Маланка». У вядомай працы Б. Яцымірскага (1914) адзначалася, што ў Падольскай губерні[2] асаблівасць персанажнага кода «Маланкі» складаюць маскі салдат ці ўланаў (і): «Цікавымі і загадкавымі для разумення служаць салдаты, якія выступаюць у ролі распарадчыкаў карнавалу. Ці з'яўляюцца яны бытавымі тыпамі, сказаць складана. Адзін з салдат выступае ў ролі фельчара» [9, с. 70]. Наяўнасць гэтых вобразаў можа быць патлумачана тым, што ў XIX ст. ці раней абыходная аўтэнтычная традыцыя свята «Маланка» сутыкнулася і засвоіла на перыферыйным узроўні элементы народнай драмы ў яе жанравай мадыфікацыі (абыход). У якасці прыкладу згадаем персанажы знакамітай Краснаільскай Маланкі Чарнаўцоўскай вобласці Украіны. Сярод іх сустракаюцца маскі, якія вельмі нагадваюць убранне семежаўскіх цароў (

). З абрадавых атрыбутаў назіраецца характэрны і для Семежава , які служыць адсылкай да народнай драмы «Цар Максімілян»[3].

Вайсковы фактар прасочваецца і ў традыцыі шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна[4]. Яго цэнтральным персанажам выступае Вершнік – салдат у шынялі з шабляй з прымацаванай на ніжняй частцы тулава спецыяльнай канструкцыяй з маскай Каня. Пры тым, што – шырока распаўсюджаны ва ўсходніх і заходніх славян персанаж абрадавага маскавання [10, с. 101], а абыходы з кабылай (канем) – з'ява, характэрная для Палесся [11, с. 24–25; 44–46], пытанне ўплыву культуры вайсковага соцыуму на традыцыю шчадравання «Конікі» нам здаецца небеспадстаўным. Гэты ўплыў можа быць прасочаны ў кірунку атрыбутыўнага кода,

[1] Марынарка – жакет, пінжак.

[2] Сёння – тэрыторыя на поўдні Хмяльніцкай вобласці. У Беларусі абыходы шчадроўнікаў з парай маскаваных персанажаў – Васілём і Маланкай – характэрны для некаторых паўднёва-ўсходніх раёнаў Гомельшчыны.

[3] У. Ястрабаў піша, што ў Херсонскай губерні народная драма «Цар Максімілян» пад назвай «Трон» была вельмі распаўсюджана ў вайсковым асяроддзі, з'ява «прыўнесеная з Велікасіі, відавочна, праз салдатаў», актыўна засвойваецца «пануючым маларускім асяроддзем». Гл.: Ястребов В. Святочная народная драма «Трон» в Херсонской губ. // Киевская старина. – 1895. – Т. 2, № 2. – С. 55–59. Першы вядомы У. Ястрабаву спіс «Цара Максіміляна» датуецца 1864–1865 гг., ён зроблены студэнтам Кіеўскай духоўнай акадэміі ў Чэркаскім павеце Кіеўскай губерні.

[4] У 2020 г. традыцыя шчадравання «Конікі» ў Давыд-Гарадку Столінскага раёна была ўнесена ў Спіс элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны (НКС), уключаных у Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь.

«! Hc dhgx ` fhc dhgx hc ijh^Zf l_[_ dhjhex &u\ylu ` \wqhj
Hc iZg_ ` fhc iZg_ g_ ijh^Z\Zc fwg_
G_ ijh^Z\Zc fwg_ hc kih]Z^Zc ^ey k_[_
Y ` p_[_ \ughk•\ ho ^Z •o ljho ih[h_\
A iwjrh]h ` ih[hx ho •a lmjwpdh]h
A ^jm]h]h ` ih[hx ho ^Z •a g_f_pdh]h
A ljwpv_]h ih[hx ho ^Z a ihevkdh]h
Qwj_a fhjw kdhq•\ ^Z c kljwf_gZ g_ aZfhq•\ «! > @

Высновы. Зафіксаваны ў 1956 г. у Рэчыцкім раёне калядны абыход з маскаванымі персанажамі з'яўляецца рэліктам традыцыі шчадравання, якая яшчэ ў пачатку XX ст. існавала на ўкраінскім і беларускім Палессі і ў Цэнтральнай Беларусі. Найбольш поўна яе змест сёння рэпрэзентуе семежаўскі абрад «Цары»[1], атрыбутыўны код якога ўвасабляе «вайсковы» касцюм персанажаў, вярбальна-акцыянальны код вызначаюць гульнёва-драматызаваныя дзеі «вайсковага абыходу», элементы народнай драмы «Цар Максімілян» і салдацкая песня. Засваенне гэтай традыцыі на перыферыйным узроўні назіраецца ў заходнепалескім абыходзе «Конікі». Вывучэнне малавядомых фактаў беларускага фальклору, а таксама параўнальна-гістарычны аналіз з улікам шырокага сацыяльна-культурнага кантэксту даюць падставы для паглыблення навуковага пошуку ў пытанні эвалюцыі народнай драмы. Яна акрэслілася ў другой палове XIX ст. пад уплывам культуры сацыяльна-прафесійнай групы вайскоўцаў і выявілася ў адгалінаванні ад класічнай стацыянарнай формы народнага відовішча мадэрнізаваных форм рухомых паказаў.

Дадатак[2]

<Пазначэнне збіральніка: *Апісанні некаторых калядных свят*>

«Хлопцы ў Коляды ўстрайвалі такі маскарад. Сабяруцца чалавек трыццаць, зробяць такую адзежу, купяць эпалеты, салдацкую адзежу. Там у іх былі: цар, Адолька – сын цара, доктар, жыд, цыган. Ходзяць яны па хатах, іграюць, спяваюць, праздраўляюць гаспадароў. Ім давалі за гэта хто што. Спяваюць, значыць, так:

– Ездзіў, хадзіў рускі цар, праваслаўны гусадар. Ён караў многа цароў, забраў многа гарадоў ад Масквы і да Парыжа і слаўны горад пераязджаў. Ці падчыняецца яшчэ ці не?

– Я не веру царом, я веру праваслаўным.

– Аніка-воін, прывядзі майго сына!

Сын выходзіць.

Ці верыш кумірскім багам?

Я веру Ісусу Хрысту!

– Прыдаць яму жызней канец і сказаць, што вялеў так ацец.

І тут гарадавыя шашкамі шах-шах, і ён ляжыць. Прыходзіць Жыд, здымае шаламок. Цар загадвае:

– Прыбраць ента, штоб ента не тлела, не смярдзела, штоб вораны не клевалі, сабакі не церзалі.

Жыд нагінаецца і гаворыць:

– Сюды суп варыць, а сюды с…ць хадзіць.

– Што ты, пархаты, пляцеш мне?

– А я так лячу: скулы выразаю, балячкі ўстаўляю. Ка мне прыходзяць на нагах, а ўязджаюць на санях.

Цыган з жыдам дзяржыцца, іх цягнуць. Маладзеж гуляла, плясала тады. Потым спявалі песню, калі вадзілі казу. Пачыналася яна так:

А дзе каза рогам, / Там жыта стогам. / А дзе каза наступіць, / Там жыта блішчыць, / А дзе каза нагой, / Там жыта капой. / Го-го, каза, го-го, шэрая, / Што дзелала? / Соль дарагая, / Ты расхадзіся, развалачыся / Па сяму-таму, па-хазяйскаму.

За песні хадзяін даваў хлопцам выпіць. За казу звычайна выбіралі якога-небудзь хлопца. Кажух вывернуць, надзенуць на рукі і ногі, прыставяць рожкі, зробяць маску – вось і каза гатовая. Абычна ігралі адны хлопцы і цара, і цыгана, і казу. Якаў Атрошка заўсёды быў за жыда, дык яго прызвалі жыдком, нават дзяцей яго і цяпер жыдкамі завуць. Вось як яно было» [14, л. 13–20].

Запісана 08.07.1956 г. І. К. Цішчанкам ад Ф. С. Сівухі, 79 год, непісьменнай, в. Ровенская Слабада Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці.

[1] У аўтэнтычным выглядзе абрад "Цары" праіснаваў да канца 1960-х гг., у той час як рэчыцкі, які запісваў І. К. Цішчанка, у сярэдзіне 1950-х гг. ужо ўзгадваўся як мінуўшчына. Гл.: Басько В. І., Валодзіна Т. В. Калядныя абыходы // Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : Цэнтральная Беларусь. – Т. 5, кн. 1. – Мінск : Выш. шк., 2010. – С. 65–67.

[2] Мова наратыва захавана, выпраўлены асобныя знакі прыпынку, атрыбуцыя падаецца паводле архіўных дакументаў.

Спіс выкарыстаных крыніц

1. Виноградова, Л. Н. Колядование / Л. Н. Виноградова // Славянские древности : этнолингвист. слов. : в 5 т. / РАН, Ин-т славяноведения и балканистики. – М., 1999. – Т. 2. – С. 570–576.

2. Романов, Е. Белорусский сборник : [в 9 вып.] / Е. Романов. – Вильна : Тип. А. Г. Сыркина, 1912. – Вып. 8 : Быт белоруса. – 600 с.

3. Калядны абрад «Цары» [Электронны рэсурс] // Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны. – Рэжым доступу: http://livingheritage.by/nks/2041/?sphrase_id=62580. – Дата доступу: 14.02.2021.

4. И. Б. «Царь-Максимильян» в Ковеле / И. Б. // Киев. старина. – 1887. – Т. 19, № 12. – С. 798–799.

5. Каллаш, В. В. К истории народного театра. Царь Максимилиан: (критические замечания и тексты) / В. В. Каллаш. – М. : А. А. Левенсон, 1899. – 22 с.

6. Волков, Р. М. Народная драма «Царь Максимильян»: опыт разыскания о составе и источниках / Р. М. Волков. – Варшава : Тип. Варшав. учеб. округа, 1912. – 77 с.

7. Еремин, И. П. Драма-игра «Царь Ирод» / И. П. Еремин // Труды Отдела древнерусской литературы / Акад. наук СССР, Ин-т лит. – М. ; Л., 1940. – Т. 4. – С. 223–240.

8. Стэльмах, Д. У. Узнікненне і развіццё народнай драмы на Беларусі / Д. У. Стэльмах // Вес. Акад. навук БССР. Сер. грамад. навук. – 1982. – № 6. – С. 92–98.

9. Яцимирский, Б. Ц. «Маланка» как вид святочного обрядового ряжения / Б. Ц. Яцимирский // Этногр. обозрение. – 1914. – № 1–2. – С. 6–77.

10. Белова, О. В. Солдат / О. В. Белова // Славянские древности : этнолингвист. слов. : в 5 т. / РАН, Ин-т славяноведения и балканистики. – М., 2014. – Т. 5. – С. 99–101.

11. Кухаронак, Т. І. Маскі ў каляндарнай абраднасці беларусаў / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Ураджай, 2001. – 237 с.

12. Традыцыя шчадравання «Конікі» [Электронны рэсурс] // Жывая спадчына Беларусі: інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны. – Рэжым доступу: http://livingheritage.by/nks/7748/?sphrase_id=62581. – Дата доступу: 15.02.2021.

13. Виноградов, Н. Н. Народная драма «Царь Максимильян» / Н. Н. Виноградов // Сборник отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. – СПб., 1914. – Т. 90, № 7. – С. 97–166.

14. Фонд ІМЭФ. – Ф. 8. Воп. 1. Спр. 39. Сш. 1. Л. 13–20.

References

1. Vinogradova L. N. Caroling. *Slavyanskie drevnosti: etnolingvisticheskii slovar'* [Slavic antiquities: ethnolinguistic dictionary]. Moscow, 1999, vol. 2, pp. 570–576 (in Russian).

2. Romanov E. R. *Belarusian collection. Vol. 8. Life of a Belarusian*. Vil'na, Typografiya A. G. Syrkina Publ., 1912. 600 p. (in Belarusian).

3. Christmas rite "Cary". *Living Heritage of Belarus: Inventory of the Intangible Cultural Heritage.* Available at: http://livingheritage.by/nks/2041/?sphrase_id=62580 (accessed 14.12.2019) (in Belarusian).

4. I. B. "Tsar Maximilian" in Kovel. *Kievskaya starina* [Kiev antiquity], 1887, vol. 19, no. 12, pp. 798–799 (in Russian).

5. Kallash V. V. *On the history of the folk theater. Tsar Maximilian: criticisms and texts*. Moscow, A. A. Levenson Publ., 1899. 22 p. (in Russian).

6. Volkov R. M. *Folk drama "Tsar Maximilian" study of its content and sources*. Warsaw, Warsaw Academic District Printing House, 1912. 77 p. (in Russian).

7. Eremin I. P. Drama-game "Tsar Herod". *Trudy Otdela drevnerusskoi literatury* [Proceedings of the Department of Old Russian Literature]. Moscow, Leningrad, 1940, vol. 4, pp. 223–240 (in Russian).

8. Stel'makh D. U. The emergence and development of folk drama in Belarus. *Vestsi Akademii navuk BSSR. Seryya gramadskikh navuk* [Proceedings of the Academy of Sciences of the BSSR. Social Science Series], 1982, no. 6, pp. 92–98 (in Belarusian).

9. Yatsimirskii B. Ts. "Malanka" as a kind of Christmas ritual dressing. *Etnograficheskoe obozrenie* [Ethnographic Review], 1914, no. 1–2, pp. 6–77 (in Russian).

10. Belova O. V. Soldier. *Slavyanskie drevnosti: etnolingvisticheskii slovar'* [Slavic antiquities: ethnolinguistic dictionary]. Moscow, 2014, vol. 5 pp. 99–101 (in Russian).

11. Kukharonak T. I. *Masks in the calendar ritual of Belarusians*. Minsk, Uradzhai Publ., 2001. 237 p. (in Belarusian).

12. Christmas caroling "Koniki". *Living Heritage of Belarus: Inventory of the Intangible Cultural Heritage.* Available at: http://livingheritage.by/nks/7748/?sphrase_id=62581 (accessed 15.02.2021) (in Belarusian).

13. Vinogradov N. N. Folk drama "Tsar Maximilian". *Sbornik otdeleniya russkogo yazyka i slovesnosti Imperatorskoi Akademii nauk* [Collection by Department of Russian Language and Literature of the Imperial Academy of Sciences]. St. Petersburg, 1914, vol. 90, no. 7, pp. 97–166 (in Russian).

14. *Archive of the Institute of Art History, Ethnography and Folklore of the NAS of Belarus*. Fund 8, inventory 1, case 39, notebook 29, sheet 50 (in Belarusian).

Информация об авторе

Гулак Анастасия Анатольевна – кандидат филологических наук, доцент. Белорусский государственный университет культуры и искусств (ул. Рабкоровская, 17, 220007, Минск, Республика Беларусь). E-mail: rodolfina.hulak@tut.by

Information about the author

Nastassia A. Hulak – Ph. D. (Philol.), Associate Professor. Belarusian State University of Culture and Arts (17 Rabkorovskaya Str., Minsk 220007, Belarus). E-mail: rodolfina.hulak@tut.by